включенности в деятельность всех учащихся инклюзивного класса и формированию толерантности. Анализ опыта позволяет выявить следующие ресурсы инклюзивного образования:

1) формирование у учащихся понимания и принятия людей с ограниченными возможностями;

2) освоение способов разрешения конфликтов, изучение национальных особенностей других народов;

3) развитие толерантного самосознания у родителей, педагогов и специалистов, работающих с детьми с особенностями развития;

4) распространение идей инклюзии в социальной среде.

Таким образом, использование в инклюзивных классах методик обучения и воспитания, которые базируются на принципах педагогики сотрудничества; методах разноуровнего обучения; приемах гуманистического воспитания, направленных на ликвидацию различных барьеров в инклюзивной образовательной среде позволят максимально раскрыть личностный потенциал каждого учащегося, а также наиболее полно реализовать права детей с ограниченными возможностями на получение качественного образования и полноценную социализацию в соответствии с индивидуальными возможностями.

**Литература**


1. *Денежкина Д. В.* Обучение и воспитание в целостном педагогическом процессе в условиях инклюзивного образования // [Электронный ресурс]. Код доступа: http://www.b17.ru/article/44780/ Дата доступа: 10.03.2016.
2. *Загуменнов Ю. Л.* От инклюзивного образования к инклюзивному обществу // Адукацыя і выхаванне. Столичное образование сегодня. 2008. № 11. С. 12–15.
3. *Савельева Т. М., Гриханов В.П., Коноплева А.Н.* Инклюзивное образование: состояние, проблемы, перспективы // Минск. 2007. С. 17-86.


## КАНЦЭПЦЫЯ ФІЗІЧНАГА ВЫХАВАННЯ А. СНЯДЭЦКАГА Ў КАНТЭКЦЕ ЕЎРАПЕЙСКАЙ ПЕДАГАГІЧНАЙ ДУМКІ XVIII – XIX СТАГОДДЗЯЎ


**І. Т. Міхаловіч**


Эпоху Асветніцтва, якая прыпадае на XVIII ст., называюць “стагоддзем педагогікі”. Гэта час распаўсюджвання ведаў і асветы на шырокія масы. Асветнікі лічылі адукацыю, навуку, набыццё ведаў шырокімі народнымі масамі панацэяй ад усіх сацыяльных бед. Лічылася, што распаўсюджванне Асветы павінна ісці як зверху, шляхам адпаведных рэформаў, так і знізу – праз стварэнне грамадскіх школ, іншых асветніцкіх устаноў [1]. У сацыяльнай сферы была абвешчана новая мараль, заснаваная на законе прыроды. Ідэалам быў абвешчаны

чалавек спрадвечнай прыгажосці, якой яго надзяліла прырода. Гэты ідэал сфарміраваўся пад уплывам антычнага мастацтва, а таксама медыцыны, вызваленай ад царкоўных дагматаў. Французскія дактары Андры, Вердзье і іншыя сцвярджалі, што рух умацоўвае мышцы, надае ім гнуткасць, спрыяе кровазвароту і абмену рэчываў. У французскай «Энцыклапедыі, або Тлумачальным слоўніку навук, мастацтваў і рамёстваў» гаворыцца, што гігіена умацоўвае здароўе, касметыка – прыгажосць, а фізічныя практыкаванні – сілу. Аднак сярод французскай арыстакратыі з рухальных практыкаванняў віталіся толькі тыя, якія былі неабходнымі для прыдворнага этыкету: танцы, фехтаванне і верхавая язда. Вядучыя педагогі-асветнікі таго часу бачылі згубнасць захапленняў арыстакратаў для фізічнай культуры ўсяго грамадства. Яны заўважылі фізічную дэградацыю моладзі і ў сваіх працах спрабавалі знайсці шляхі для вырашэння праблемы.

Вядучая роля ў распрацоўцы праблемы фізічнага выхавання належыла Ж.-Ж. Русо (1712–1778), які свае ідэі наконт гэтага накірунку педагагічнай дзейнасці раскрыў у трактаце «Эміль, або Аб выхаванні» (1762), дзе крытыкаваў тагачасную практыку выхавання дзяцей пануючых саслоўяў і распрацаваў у адпаведнасці з натуральным правам план выхавання новага чалавека. Французскі педагог-філосаф лічыў, што ў натуральным стане ўсё з’яўляецца ідэальным, таму заклікаў і выхаванне дзяцей зрабіць натуральным, каб яно адпавядала ўзросту дзіцяці і ажыццяўлася ў натуральных прыродных умовах. Галоўным натуральным правам чалавека Ж.-Ж. Русо лічыў права на свабоду, якое распаўсюдзіў у тым ліку і на адукацыю чалавека, упершыню абгрунтаваўшы ідэю вольнага выхавання. Згодна з ёю, выхаванне павінна ісці за прыродай дзіцяці, дапамагаючы ёй і ухіляючы ад шкоднага ўплыву. Русо быў супраціўнікам аўтарытарызму ў выхаванні, пратэставаў супраць падпарадкавання дзіцяці загадам дарослых. На думку Русо, дзяцей павінны абмяжоўваць не правілы і забароны, устаноўленыя выхавацелямі, а няўхільныя законы прыроды [3].

Фізічнае выхаванне Русо лічыў асновай фарміравання «натуральна-вольнага» чалавека. Яно павінна было забяспечыць поспех разумовага, працоўнага і маральнага выхавання. Самую галоўную ролю фізічнае выхаванне адыгрывае ў развіцці дзяцей ад нараджэння да двух гадоў, у гэты перыяд асновайй яго паспяховасці выступаюць свабода руху. У фізічным выхаванні падлеткаў і юнакоў Ж.-Ж. Русо рэкамендаваў ужываць спаборніцкі метад, прапаноўваў праводзіць нацыянальныя святы, уключаючы ў праграму масавыя спартыўныя спаборніцтвы і гульні. Паводле задумак французскага асветніка, святы павінны былі быць адным з галоўнейшых сродкаў забавы і нацыянальнага яднання

«свабодных» дробных рамеснікаў, умацавання «дзяржавы розуму», заснаванай на «грамадскім дагаворы». Думкі Русо аб фізічным выхаванні былі выкарыстаныя пасля Ф. Амаросам пры стварэнні французскай натуральна-прыкладной гімнастыкі [3].

Погляды Русо на фізічнае і разумовае выхаванне ў асноўным тычыліся да мужчынскага полу. Выхаванне ж жанчын павінна застацца традыцыйным, гэта значыць жанчына была падначаленая мужчыне, і таму ёй не патрэбна шырокая разумовая адукацыя. Дастаткова было паклапаціцца аб фізічным развіцці дзяўчынкі, эстэтычным выхаванні і ўменні весці хатнюю гаспадарку.

Філосаф, палітолаг і педагог Дж. Лок (1632–1704) распрацаваў канцэнцыю выхавання джэнтэльмена – здаровага, маральнага і разумнага чалавека. Выхаваўчы працэс Лок падзяляў на тры часткі: маральнае выхаванне, фізічнае і разумовае. Асновай фізічнага выхавання ў яго канцэпцыі было ўмацаванне маладога арганізму. Гэта партэбна каб арганізм быў моцным, «здольным пераносіць усялякія нязгоды, перамены і стомленасць» [4, с. 85]. Лок раіць загартоўваць дзяцей (не апранаць занадта цёпла, штодня мыць ногі у халоднай вадзе, каб дзіця было застрахавана ад прастуды); больш знаходзіцца на свежым паветры; як мага раней вучыць дзяцей плаваць; прывучаць да простай і ўмеранай ежы і г. д. Пры гэтым важна не зрабіць дзіця рабом звычкі. Пры выкананні пералічаных парад фізічнае выхаванне зблiжаецца з выхаваннем духоўным, таму што цела прывучаецца стрымліваць свае жаданні і патрэбы, саступаючы месца патрабаванням духу: цела робіцца «здольным слухацца загады духу» [4, с. 89].

Анджэй Снядэцкі (1768–838) – сусветна вядомы вучоны эпохі Асветы, прафесар Віленскага ўніверсітэту, заснавальнік Віленскага медыцынскага таварыства – праявіў свой талент у розных галінах навукі: хіміі, біялогіі, медыцыне, біяхіміі, педагогіцы, літаратуры. Анджэй Снядэцкі – аўтар больш чым сямідзесяці навуковых прац, самымі вядомымі з якіх з’яўляюцца «Тэорыя арганічных субстанцый» і «Асновы хіміі». Анджэй Снядэцкі быў адным з першых, хто правёў медыцынскі аналіз растройстваў псіхікі ў дарослых і дзяцей.

Найбольш вядомая педагагічная праца А. Снядэцкага «Пра фізічнае выхаванне дзяцей» - гэта першая спроба вучонага навукова абгрунтаваць і папулярызаваць гігіену, захаванне і ўмацаванне дзіцячага здароўя ў польскамоўным пісьменстве. Ва ўступнай частцы сваёй працы Анджэй Снядэцкі высвятляе значэнне фізічнага выхавання, параўноўваючы ролю фізічнага выхавання ў станаўленні асобы з прафілактыкай у медыцыне [2, с. 94].

Першая ўмова добрага выхавання ў канцэпцыі А.Снядэцкага – гэта спазнанне прыроды дзіцяці, якое павінна быць выхавана. Па меркаванні навукоўца, нельга ўсталёўваць агульныя правілы выхавання, якія падыходзілі б аднолькава да ўсіх дзяцей незалежна ад асаблівасейі магчымасцей кожнага з іх. «Чалавек, – кажа Анджэй Снядэцкі, – гэта не адна і тая ж аднолькавая форма, але існасць, якая неабмежавана змяняецца. Прырода чалавека любіць разнастайнасць, у ёй, яе сіла, мудрасць і веліч; а род людскі адкрыты, на паверхні ўсёй зямлі бясконца нешта змяняецца, будуецца і перавыхоўваецца. Не адзін, а многія маюць дасканалыя прыклады, якіх мы нават вымераць не можам» [2, с. 99]. Пры выхаванні дзіцяці, лічыў наш суайчыннік, неабходна абраць такі «прыклад дасканаласці», які будзе адпавядаць узроўню развіцця і здольнасцям канкрэтнай асобы.

Прырода і характар дзіцяці залежыць у большай ступені ад таго, кім былі яго бацькі. «Штодзённы і гістарычны досвед, - вучыць Анджэй Снядэцкі, - што прадмет розуму і сэрца так паміж сабой злучаны, як добрыя якасці і недахопы арганічнага цела, таму што часта бачым дрэнных людзей сярод тых, якія атрымліваюць лепшую адукацыю. І адначасова найлепшыя добрыя якасці ёсць у тых, якія мелі перад сабой негатыўныя прыклады» [2, с. 83].

Снядэцкі не раіць занадта песціць дзяцей, і выконваць усе іх пажаданні: «Дзеці, схільныя ад нараджэння да невыгодных умоў, недахопу паветра і іншых праблем, не імкнуцца нічога змяніць, таму што разумеюць, што так гэтаму і быць. Вядома, яны бачаць, з кім жывуць, і церпяць такія ўмовы, пераносяць іх без шкадавання і смутку. Але распешчанае і вынянчанае дзіця ў далейшым жыцці хоць на хвіліну сустрэнецца з якімі-небудзь цяжкасцямі, няшчасцямі, не ведаючы, як сябе весці ў дадзенай сітуацыі. Яны церпяць ад гэтага і мучаюцца, а пасля таксама адразу пачынаюць хварэць. Вы, заклапочаныя маці і бабулі, якія па першым патрабаванні дапамагаеце дзіцяці і дрыжыце над ім, вы рыхтуеце свайго дзіця да сапраўднага пекла. Чалавек – гэта пястун лёсу. Лёс заўсёды непрадказальны, а няшчасці заўсёды нечаканыя – толькі той можа з усім зладзіцца, хто сілы ў сабе мае, дух і намер. Той ўсе націскі лёсу пераадолее, хто мае шмат бясстрашнасці і нічога не баіцца» [2, с. 150–151]. Снядэцкі патрабуе даць дзецям больш самастойнасці, пачынаючы з таго часу, калі немаўля вучыцца хадзіць і прыстасоўваецца да наваколля. Да 7 гадоў усе сілы педагогаў павінны быць скіраваны на фізічнае выхаванне дзяцей, пра любое навучанне не можа быць і гаворкі: «Ніхто хадзіць без ног і рабіць без рук нічога не зможа » [2, с. 185].

На працягу сваёй навуковай дзейнасці Снядэцкі выступаў за абмежаванне разумовай працы дзяцей: «Калі хто-нібудзь васьмігадоваму дзіцяці накіне на плечы цяжар, які моцны мужчына не можа панесці, усе б яго за ненармальнага прынялі. Але разумным, навуковым і вельмі светлым чалавекам лічыцца той, хто зніме гэты цяжар з чалавека і толькі дасць яму тое, што можа панесці » [2, с. 195].

А. Снядэцкі лічыў, што калі дзяцей прымушаць да навукі, то гэта не дасць станоўчых вынікаў: «Толькі цікавасцю і гульнёй можна прывабіць дзяцей да навучання, і толькі тых, у якіх паўторна з’явіліся зубкі. Паволі да навукі завабліваць трэба, але любая навука не павінна перарываць вольнага дзеяння, таму што дзіцячая воля вышэй школьных заняткаў» [2, с. 209]. Асноўным метадам і формай навучання А. Снядэцкі лічыў гульню: «Але ж нехта мне скажа: ці можна дзіця навучыць, не вучачы яго? Трэба вучыць яго праз гульню» [2, с. 210]. Навуковец таксама падкрэсліваў, што пры «выхаванні праз гульню мы атрымаем веды вельмі лёгка, без прымусу і без настаўніка, які б стаяў над галавой» [2, с. 210].

Некаторая меркаванні А. Снядэцкага набліжаюцца да ідэй вольнага выхавання, абгрунтаванага Ж.-Ж. Руссо: «Трэба каб, дзеці вучыліся гуляючы і буянячы, а мы павінны такія ім даць цацкі, якія дапамагалі б ім займацца, і ў такія месцы прыводзіць, дзе можна навучыцца тым ведам, якія мы жадаем ім даць. Прыроджаная цікаўнасць дапаможа нам у тым, што дзецям кожная рэч цікавая будзе, і яны зададуць нам тысячу пытанняў, а мы, настаўнікі, праўдзівымі будзем і на гэтыя пытанні так здолеем адказаць, каб ім цікава было» [2, с. 212].

Працы Жан-Жака Русо, Джона Лока, Анджэя Снядэцкага не страцілі сваёй актуальнасці і на сённяшні дзень. Еўрапейская педагагічная думка XVIII – пачатку XIX стагоддзяў скаладае падмурак сучаснага гуманістычнага выхавання, разглядаецца як перадумова ў фарміраванні тэорыі і практыкі асобасна арыентаванай адукацыйнай парадыгмы. Усе названыя педагогі разглядалі фізічнае выхаванне як аснову гарманічнага развіцця асобы чалавека, падкрэслівалі непарыўную сувязь паміж усімі кампанентамі выхавання і неабходнасць прыродаадпаведнасці ў іх рэалізацыі ў дачыненні да кожнага дзіцяці. Па меркаваннях Ж.-Ж. Русо, Д. Лока, А. Снядэцкага і іншых тагачасных педагогаў, спалучэнне свабоднага руху з гульнёй павінна было даць найлепшы вынік у фізічным станаўленні асобы.

**Літаратура**

1. *Barankiewicz J.* Lekcykon wychowania fizycznego i cportu czkolnego. Warczawa, 1998.
2. *Śniadecki J.* O fizycznym wychowaniu dzieci // Poznań. 1867.

3. *Коменский Я. А., Локк Д. , Ж.-Ж. Руссо, Песталоцци И. Г.* Педагогическое наследие // М. 1988.
4. *Шабаева М.Ф.* Педагогическая теория Д. Локка // М. 2003.

## СТРУКТУРНО-СОДЕРЖАТЕЛЬНЫЕ ОСОБЕННОСТИ УЧЕБНЫХ ПОСОБИЙ ПО ИСТОРИИ БЕЛАРУСИ ДЛЯ УЧАЩИХСЯ 7 КЛАССА

**И. К. Петрович**

После распада СССР и оформления Республики Беларусь как независимого государства преподавание отечественной истории в средних общеобразовательных школах стало играть особую роль в воспитании подрастающего поколения. История Беларуси в нач. 1990-х гг. стала преподноситься как история самостоятельной страны, а белорусы – как самобытный европейский народ, прошлое которого было уникальным, богатым и интересным. В связи с этим возникла необходимость создания новых учебных пособий по истории Беларуси, на что ушло два года: опубликованные в 1993 г. учебные пособия можно отнести к первому поколению учебных изданий по данной дисциплине.

В первом учебном пособии по истории Беларуси для учеников 7 класса [5] освещается период XVI –XVIII вв. Здесь рассматривается поздняя история независимого Великого княжества Литовского (ВКЛ) и история белорусских земель времен Речи Посполитой. Данное учебное пособие содержит текстовые параграфы и вопросы к ним, различный вспомогательный материал: цитаты из исторических источников, интересные сведения о великих людях изучаемой эпохи и др. Помимо хронологической таблицы и списка литературы для внеклассного чтения, автором приводится краткий терминологический словарь (75 терминов и понятий, знать определения которых было необходимо ученику 7 класса).

П. О. Лойко на страницах написанного им учебного пособия рассказывает о политической и социально-экономической жизни ВКЛ и Речи Посполитой, описывает войны и военные конфликты наших предков как с иноземцами, так и с соседним Московским княжеством. Значительное внимание уделено рассмотрению мятежа Михаила Глинского, казацко-крестьянской войны 1648-1651 гг. (ее автор характеризует как антифеодальную, но в то же время имевшую частично антипольский характер [5, с. 104]), белорусским крестьянским восстаниям XVIII в., вооруженному выступлению Тадеуша Костюшко. История культуры белорусских земель здесь изложена в одном параграфе [5, с. 158-166]. Описывая процесс присоединения территории Беларуси к Российской империи, автор отмечает, что «асноўная маса насельніцтва – сяляне і мяшчане Беларусі – спакойна, недзе абыякава ўспрынялі распад Рэчы Паспалітай», а